# Усе аблiччы акварэлi



Акварэліста, мастацтвазнаўцу, педагога Уладзіміра Рынкевіча ведаюць як аўтара шматстайных і адметных твораў, кніг пра акварэльны жывапіс, навуковых работ, рэспубліканскіх мастацка-прапагандысцкіх, выставачных праектаў. З 1975 года ён, выхаванец славутага мастацка-графічнага аддзялення Віцебскага педагагічнага інстытута, актыўна ўдзельнічае ў выстаўках (у тым ліку замежных), у міжнародных пленэрах. Яго персанальныя экспазіцыі ладзіліся ў Іспаніі, Італіі, Польшчы, Расіі, а творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, Літаратурным музеі Янкі Купалы, Віцебскім мастацкім музеі, у Нацыянальным мастацкім музеі ў Варшаве, Музеі сучаснага рускага мастацтва ў ЗША, у шэрагу галерэй Расіі. Рэпрадукцыі некалькіх дзесяткаў жывапісных твораў У. Рынкевіча выдаваліся масавым тыражом. Прытым ён плённа займаецца навукай: пасля абароны кандыдацкай дысертацыі напісаў доктарскую, на матэрыяле якой падрыхтаваў новую кнігу — "Станковая графіка Беларусі XIX — XX стст.". А яшчэ — выкладае ў БДУ культуры і мастацтваў. Персанальная выстаўка У. Рынкевіча была нядаўна зладкавана ў Палацы культуры горада Маладзечна.

**С. ВЕТКА**

***На здымку: акварэль У. Рынкевіча.***

*Фота Віктара Кавалёва*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ